Віктар Аляксандравіч Грамыка ў нашай культуры вельмі маштабная асоба. Аб ім шмат напісана як аб выдатным педагогу і мастаку, і ў гісторыі выяўленчага мастацтва яму належыць выключнае месца.

Нарадзіўся ён у в. Сенькава на Магілёўшчыне ў сям'і служачых. Дзяцінства і юнацтва звязаны з Віцебшчынай. У Оршы ён скончыў 37-ю чыгуначную школу (цяпер гэта школа № 11). У час Вялікай Айчыннай вайны стаў членам падпольнай арганізацыі К. Заслонава. Адсюль, з Оршы, пайшоў у партызаны, змагаўся ў Смаленскім дыверсійна-разведвальным палку асобага прызначэння Івана Садчыкава, непасрэдна падпарадкаваным спачатку стаўцы Заходняга фронту, потым штабу Цэнтральнага партызанскага руху, быў камісарам партызанскага атрада, адказным сакратаром падпольнай газеты "Народны мсцівец". Перажыў дзве блакады, удзельнічаў у легендарным Лепельска-Ушацкім прарыве.

Пасля вызвалення Беларусі працаваў літаратурным супрацоўнікам, мастаком у рэдакцыях газет, выдавецтвах, мастацкім рэдактарам часопіса "Маладосць". У 1951 г. скончыў Мінскае мастацкае вучылішча, а ў 1959 г. – Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (цяпер Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў). Педагогамі яго былі І. Ахрэмчык, В. Волкаў, В. Цвірка. Пасля заканчэння інстытута В. Грамыка застаўся працаваць на кафедры жывапісу асістэнтам прафесара В. Волкава. 1959– 1997 гг. у біяграфіі В. Грамыкі пазначаны як гады плённай педагагічнай працы ў Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкі інстытуце (выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт, дэкан мастацкага факультэта, прафесар (1982), кіраўнік персанальнай творчай майстэрні). У 2000 г. ён абраны ганаровым членам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Акрамя выкладчыцкай працы шмат часу на працягу многіх гадоў В. Грамыка аддаваў грамадскай дзейнасці: выконваў абавязкі адказнага сакратара праўлення Саюза мастакоў БССР (1963–1967), у 1968–1973 гг., у 1977–1982 гг.  быў старшынёй праўлення Саюза мастакоў БССР. З 1947 г. прымае актыўны ўдзел у міжнародных і рэспубліканскіх выстаўках, арганізоўвае персанальныя выстаўкі ўласных работ.

У беларускае мастацтва В. Грамыка ўвайшоў як майстар гісторыка-гераічнай карціны, буйнамаштабнага эпічнага пейзажа і псіхалагічнага партрэта. У сваіх творах мастак сцвярджае глыбокія маральныя ідэалы, ідэі патрыятызму, любві да радзімы. Карціны, прысвечаныя тэме Вялікай Айчыннай вайны, пачынаючы з дыпломнай "Дарогамі мсціўцаў"(1959), а потым – "Салдаты" (1967), "Балада пра апошнюю кулю"(1968), "1941 год. Над Прыпяццю" (1970), "Жанчынам Вялікай Айчыннай вайны прысвячаецца" (1972), "Песня аб маім атрадзе" (1978), "Балада пра ваенную маладосць" (1979), "Яблыкі ўраджаю 1941 года" (1987), "Памяці разведчыкаў майго палка" (2009) і іншых вызначаюцца сімвалічнай значнасцю вобразаў, выкарастаннем паэтычнай метафары, гармоніяй кампазіцыі і колеру. В. Грамыка сказаў прынцыпова новае слова і ў развіцці беларускага пейзажнага жывапісу, як бы нанова адкрыў прыгажосць беларускай прыроды – непаўторнай, велічнай, паэтычнай. Творы самых розных гадоў напісання: "Ільны беларускія"(1969 ), "Чырвоныя землі Полаччыны" (1970), "Жнівень" (1971–1972), "Над возерам" (1973), "Полаччына" (1974), "На радзіме Янкі Купалы", "Край полацкі – край партызанскі",  "Глубелька – сэрца блакітных азёраў Беларусі" (усе 1975), "Сонечныя пагоркі Віцебшчыны" (1976), "Полымя лістапада" (1977), "Месцамі дажджы" (1998), "За даллю даль" (1999), "Ільны беларускія" (новая версія, 2002), "Блакітнае вока Полаччыны" (2003) і інш. Мастацтвазнавец Г. Фатыхава падкрэслівае: "Кожны твор Віктара Грамыкі непаўторны, але адначасова адчуваецца нешта агульнае, што адрознівае менавіта гэтага жывапісца: выбар высокай кропкі агляду, што дазваляе ўбачыць нібыта ўсю зямлю…".* Аб гэтай асабістай адметнасці сваёй творчасці ўзгадвае і сам мастак у адным з інтэрв'ю: "Раней жывапісцы ў пераважнай большасці пісалі з таго ўзроўню, на якім насамрэч знаходзіліся, – я ж пішу з вышыні птушынага палёту. Па сутнасці, я ўвёў у пейзаж высокі гарызонт – лічу гэта сваім адкрыццём. Напэўна, жаданне "убачыць зямлю ўсю"… вынікае з майго заўсёднага імкнення ўвысь, якое ўпершыню праявілася яшчэ ў

дашкольным дзяцінстве – спробай пабудаваць самалёт.”** Дарэчы, гэты дэвіз – “Убачыць зямлю ўсю” – стаў назвай юбілейнай выстаўкі, прысвечанай 90-годдзю выдатнага мастака, якая 3 студзеня 2013 г. пры вялікай колькасці прыхільнікаў яго таленту ўрачыста адкрылася ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь. У экспазіцыі было прадстаўлена больш за 60 твораў: фігуратыўныя карціны, эпічныя і лірычныя пейзажы, псіхалагічныя партрэты сяброў і блізкіх, напісаныя ў розныя гады, – партрэт пісьменніка Я. Брыля (1968), бацькі (1977), камісара А.Ф. Юр’ева (1982), “Васіль Быкаў. Роздум” (1984), сцэнографа Я. Чамадурава (1986), аўтапартрэт (1988).

Віктар Грамыка вядомы не толькі як мастак, але і як літаратар. Ён падрыхтаваў да друку кнігу ўспамінаў ”Радуга над дорогой”, якая выйшла ў 2000 г. у выдавецтве “Беларусь”. Успаміны мастака ахопліваюць перыяд з ранняга дзяцінства да Дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. У канцы 2012 г. В. Грамыка падрыхтаваў да друку іх працяг (“За облаками – солнце”, “Свет и тени уходящего века”). Урыўкі з гэтых кніг-успамінаў часткова друкаваліся на старонках часопіса “Мастацтва”.

Творы В. Грамыкі знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Беларускім музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску, фондах Беларускага саюза мастакоў, Магілёўскім абласным мастацкім музеі імя П.В. Масленікава, Музеі Маскоўскага Крамля і ў фондах Міністэрства культуры Расіі, Траццякоўскай галерэі (Масква), у мастацкіх музеях Расіі, Украіны, Казахстана, прыватных калекцыях у Беларусі і за мяжой – Расіі, Германіі, ЗША, Японіі, Італіі, Балгарыі, Венгрыі… Маюцца творы мастака і ў Аршанскай гарадской мастацкай галерэі Віктара Грамыкі, якая была адкрыта ў 2008 г. у адрэстаўраваным гістарычным будынку былога езуіцкага калегіума падчас правядзення ў Оршы “Дажынак – 2008”. Адна з работ В. Грамыкі – “Песня аб маім атрадзе” (2006) сярод мноства іншых твораў прафесійных мастакоў упрыгожвае інтэр’ер новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Гэты твор – новая “версія” знакамітай карціны 1978 г. (першы варыянт твора знаходзіцца ў Маскве).

Віктар Аляксандравіч узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны 1-й і 3-й ступені, Чырвонай Зоркі, “Знак Пашаны”; медалямі “За адвагу”, “Партызану Айчыннай вайны” 1-й ступені, залатым медалём ВДНГ СССР (1978), сярэбраным медалём імя М. Грэкава (1978), медалём Ф. Скарыны (1996) і іншымі, а таксама Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР і Вярхоўнага Савета РСФСР.

* Мастацтва. – 2003. – № 2. – С. 27.

** Мастацтва. – 2008. – № 1. – С. 34.

Матэрыял падрыхтаваны ў 2013 г.